Першы квартал 2026 года адзначыўся мноствам падзей. Прайшло шмат мерапрыемстваў, прысвечаных адкрыццю Года беларускай жанчыны, адраджэнню культуры і духоўнасці, патрыятычнаму, грамадзянскаму і сямейнаму выхаванню.

## Год беларускай жанчыны




У рамках Года беларускай жанчыны ва ўсіх бібліятэках Шчучынскага раёна прайшлі тэматычныя мерапрыемствы і кніжныя экспазіцыі. Экспазіцыі прысвечаны выдатным жанчынам, чыя праца, талент і подзвігі ўнеслі неацэнны ўклад у гісторыю і развіццё Беларусі: гераіням працы, дзеячкам навукі, культуры, мастацтва і грамадскага жыцця. У кожнай бібліятэцы афармлены тэматычныя вітражы, якія падкрэсліваюць важнасць ролі жанчыны ў нашым грамадстве.



**11 лютага** ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі адбылося адкрыццё новага праекту





“Авторитет имени”. Першая сустрэча прайшла ў фармаце адкрытага дыялогу “Рэаліі сучаснасці”. Ганаровымі гасцямі і спікерамі сталі дзве дзіўныя жанчыны, чые імёны добра вядомыя ў раёне: Святлана Уладзіміраўна Малюгіна — старшыня Савета ветэранаў Шчучынскага раёна і Таццяна Валянцінаўна Ступакевіч – былы рэдактар раённай газеты “Дзянніца”. Госці прынеслі з сабой не проста ўспаміны, а сапраўдныя сведчанні часу: асабістыя ўзнагароды; сапраўдныя дакументы; унікальныя фатаграфіі з сямейных архіваў; кадры відэафільма, якія адлюстроўваюць прафесійны шлях і гісторыю сям'і.

**22 студзеня** філіял “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка” запрасіў юных



чытачоў на гістарычны экскурс “Беларускія жанчыны, якія апярэдзілі час”. У рамках сустрэчы школьнікам прадставілі прэзентацыю “Вялікія жанчыны Беларусі”, расказаўшы пра выдатных суайчынніц. Разам з бібліятэкарам удзельнікі разважалі над пытаннем: “Што

значыць быць жанчынай у сучасным свеце?”, успамінаючы тых, чые імёны назаўжды ўпісаны ў гісторыю Беларусі.

**24 студзеня** ў філіяле “Бакштаўская сельская бібліятэка” прайшла тэматычная гадзіна “Іх жыццё — сюжэт для раманаў”. Бібліятэкар расказала пра выдатных беларускіх жанчын, іх лёсы і подзвігі. Госці таксама маглі азнаёміццаз кніжнай выставай “Табою вечны мір і чалавек”.

**29 студзеня** ў філіяле “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” прайшоў віртуальны часопіс “Жанчыны ствараюць гісторыю”. Падчас мерапрыемства хлопцы і дзяўчынкі гарталі віртуальныя старонкі гісторыі Беларусі, гісторыі, якую ў тым ліку стварылі жанчыны. Таксама дзеці даведаліся аб 10 вынаходствах, створаных жанчынамі.

**31 студзеня** супрацоўнікі філіяла “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” прынялі ўдзел у літаратурна-музычнай кампазіцыі “Ганаруся, што беларусам завуся!”. Педагогі разам з выхаванцамі Цэнтра вольнага часу “Спадчына” ўпрыгожылі свята песнямі і танцамі. Была аформлена выстава “Беларускія жанчыны ў сугуччы мінулага і сучаснасці”.

**14 лютага** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава” прайшоў актуальны дыялог “Беларуская Жанчына: Учора, Сёння, Заўтра”. Школьнікі даведаліся пра вялікіх асоб, такіх як Еўфрасіння Полацкая, Алаіза Пашкевіч (Цётка) і Марына Васілевіч.

## Патрыятычнае і грамадзянскае выхаванне
## *(Международный день памяти жертв Холокоста)*

**25 студзеня** ў філіяле “Бакштаўская сельская бібліятэка” прайшоў урок памяці “Свяча памяці ахвярам Халакосту”. Бібліятэкар расказала пра злачынствы фашыстаў на тэрыторыі Шчучынскага раёна, а таксама пра трагічныя старонкі гісторыі Васілішкаўскага і Астрынскага гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Удзельнікі таксама змаглі азнаёміцца з кніжнай выстаўкай “Рэха выйны і памяць сэрца”.

**25 студзеня** ў філіяле “Навадворская сельская бібліятэка” адбылася гадзіна памяці “Халакост: памяць без тэрміну даўнасці”. Бібліятэкар расказала пра злачынствы фашыстаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі, канцлагерах і гета на Шчучыншчыне. Да мерапрыемства была падрыхтавана тэматычная выстава “Мінулых гадоў жывая памяць”.

**25 студзеня** ў філіяле “Ракавіцкая сельская бібліятэка” прайшло гістарычнае падарожжа “Халакост – як гэта было”. Асаблівая ўвага была нададзена гісторыі канцлагера Асвенцым, які стаў сімвалам трагедыі Другой сусветнай вайны. У завяршэнне прайшоў агляд літаратуры пра генацыд беларускага народа.



**25 студзеня** ў філіяле “Тур'янская сельская бібліятэка” прайшла гадзіна памяці і смутку “Халакост: у сэрцы і памяці вечна”. Падчас мерапрыемства прысутныя паглядзелі дакументальны фільм “Кароткая гісторыя канцлагераў: Асвенцым” і азнаёміліся з кніжнай выставай “Генацыд беларускага народа”.

**27 студзеня** супрацоўнікі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цеткі правялі літаратурны экскурс

"Халакост: памяць без тэрміну даўнасці". Мерапрыемства мела асаблівы, краязнаўчы акцэнт. Падлеткі ўважліва вывучалі дакументы і фотаздымкі на выставе, прысвечанай лёсу жыхароў Шчучынскага раёна — ахвяр нацысцкага генацыду. Супрацоўнікі бібліятэкі данеслі да моладзі галоўную думку: памяць пра Халакост — гэта неабходны ўрок для ўсяго чалавецтва, каб падобныя жахі ніколі не паўтарыліся.

**28 студзеня** члены клуба "Спадчына" філіяла "Астрынская гарпасялковая бібліятэка" былі удзельнікамі ўрока памяці "Халакост на тэрыторыі Шчучынскага раёна". Школьнікі пачулі расказ пра Астрынскае гета, гета ў Шчучыне, Васілішках, Жалудку і Каменцы. Яны з цікавасцю слухалі пра тое, як простыя людзі ратавалі яўрэяў з гета, разглядалі фатаграфіі з гісторыі яўрэйскага гета ў Астрыне.

**29 студзеня** філіял "Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка" запрасіў навучэнцаў на дыялог памяці "Страшныя старонкі гісторыі". Бібліятэкар расказала хлопцам і дзяўчынкам пра тое, што такое "Халакост" і "гета". Дзеці пачулі сумную статыстыку аб колькасці ахвяр Халакоста, аб спаленых разам з жыхарамі вёсках, у тым ліку на тэрыторыі Шчучынскага раёна, і аб лагерах смерці. Асаблівую ўвагу бібліятэкар звярнула на лёс яўрэяў Жалудоцкага гета.

**31 студзеня** ў філіяле "Шчучынская дзіцячая бібліятэка" прайшла гадзіна памяці "Халакост: памяць і папярэджанне". Удзельнікі даведаліся аб трагедыі яўрэйскага народа ў Шчучыне, дзе жылі больш за 2,5 тыс. яўрэяў. Дэманстраваўся тэматычны ролік, які паказваў



храналогію падзей 1941-1944 гадоў - час існавання гета. Дзеці таксама даведаліся аб месцазнаходжанні месцаў зняволення яўрэяў.

## Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

**13 сакавіка** ў Публічным цэнтры прававой інфармацыі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі прайшоў прававы дыялог “Па Канстытуцыі жыве мая краіна”. Мерапрыемства адбылося ў рамках праграмы “Я ў прававой прасторы”. Удзельнікамі сталі навучэнцы 9 “В” класа СШ №1 г. Шчучына імя А. Я. Андрэева. Запрошаныя эксперты: Козырава Вікторыя Дзмітрыеўна - загадчык натарыяльнай канторы; Панасевіч Юлія Генадзеўна — участковы інспектар ІСН. Госці расказалі дзецям пра гісторыю стварэння Канстытуцыі, яе структуру і ролю ў жыцці грамадства, а таксама абмеркавалі асноўныя правы і абавязкі непаўналетніх грамадзян.

**13 сакавіка** ў філіяле “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” прайшоў грамадзянскі форум “Краіны велічны Закон”. Атмасферу сустрэчы ўпрыгожылі: вершы пра Беларусь, сімвалы краіны і Канстытуцыі. У завяршэнні дзеці пазнаёміліся з тэматычнай выставай “Краіны велічны Закон”.

**14 сакавіка** філіял “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка” правёў інфармацыйна-прававы дыялог “Закон для ўсіх і кожнага”. Удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з гісторыяй стварэння і структурай Канстытуцыі, вывучылі правы і абавязкі грамадзян, паглядзелі відэапрэзентацыі і тэматычныя ролікі, замацавалі веды ў прававых віктарынах і конкурсах.

# Міжнародны дзень роднай мовы

У бібліятэках Шчучыншчыны прайшлі мерапрыемствы да Міжнароднага дня роднай мовы. У гэтыя дні бібліятэкі раёна ператварыліся ў сапраўдныя цэнтры шанавання беларускага слова. Гасцей чакала мноства конкурсаў і літаратурных віктарын, дзе кожны мог праверыць свае веды па беларускай мове і літаратуры. Асабліва ўрачыста гучалі вершы беларускіх пісьменнікаў у выкананні як юных чытачоў, так і паважаных гасцей бібліятэк. Мерапрыемствы яшчэ раз нагадалі ўсім, наколькі важна берагчы і шанаваць роднае слова, перадаючы яго з пакалення ў пакаленне.



**20 лютага** філіял “Тур'янская сельская бібліятэка” запрасіў выхаванцаў дзіцячага сада аг. Тур’я на літаратурную хвілінку “Чароўны свет роднай мовы”. Дзеці з захапленнем слухалі і чыталі вершы, казкі, лічылкі знакамітых беларускіх пісьменнікаў. Да мерапрыемства была аформлена кніжная выстава “Жывое беларускае слова”. Сустрэча завяршылася праглядам мультфільмаў па беларускім народным казкам.

**20 лютага** бібліятэкар філіяла “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка” правяла турнір знаўцаў “Гучы, родная мова!”. Падчас мерапрыемства гучалі



цікавыя выказванні беларускіх пісьменнікаў аб роднай мове. Разам з беларусачкай дзеці адгадвалі тэматычныя загадкі, адказвалі на пытанні літаратурных віктарын. Школьнікі з задавальненнем уключыліся ў лінгвістычную гульню “Знаўцы роднай мовы” і хутка перакладалі словы з рускай мовы на беларускую.

**21 лютага** філіял “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” далучыўся да святкавання Міжнароднага дня роднай мовы і правёў акцыю “Слова да слова - будзе мова”. На працягу дня карыстальнікам раздаваліся закладкі з выразамі па-беларуску, даваліся заданні, напрыклад “Знайдзі адпаведнік малюнку”, а таксама прапанаваліся да чытання кнігі на роднай мове.



**24 лютага** ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі адбылася цёплая і натхняльная сустрэча. Госці сабраліся на Дзень пісьменнікаў Шчучыншчыны пад назвай “Аўтограф на карце роднай Беларусі”. Асаблівай госцяй мерапрыемства стала таленавітая пісьменніца Ганна Каспер. Яна падзялілася з прысутнымі сакрэтамі творчасці, расказала пра свае кнігі і, канешне, падаравала ўсім прысутным радкі сваіх вершаў. Удзельнікі сустрэчы гаварылі пра тое, як важна шанаваць роднае слова і захоўваць культурную спадчыну.





## Культура і духоўнасць

**11 сакавіка** у ДУК “Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі” адбылося традыцыйнае штогадовае мерапрыемства, прымеркаванае да Дня праваслаўнай кнігі. Духоўная палітра “Святло душа па кроплі набірае” зноў аб'яднала знатакоў праваслаўнай літаратуры і ўсіх, хто цікавіцца духоўнай спадчынай. Значная частка мерапрыемства была прысвечана святым жанчынам у праваслаўнай традыцыі. Госці даведаліся пра жыццёвы подзвіг святых жонак, іх уклад у гісторыю царквы і культуру. Асаблівая ўвага была нададзена выданням, якія вучаць дабру, міласэрнасці і маральнасці - тым каштоўнасцям, што застаюцца вечнымі арыенцірамі для кожнага пакалення.



**14 сакавіка** чытачы сабраліся ў філіяле “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” на Дзень праваслаўнай кнігі “Вечныя кнігі жывых думак”. Госцем быў настаяцель храма Святога Спаса айцец Алексій Талмазан. Ён паведаміў пра гісторыю свята, важнасць духоўнага чытання і кнігі, якія прымушаюць задумацца. Айцец Алексій падзяліўся вопытам стварэння бібліятэкі пры храме і адказаў на пытанні прыхаджан. Да мерапрыемства афармілі выставу — шмат кніг разабралі сябры пасля сустрэчы!



**14 сакавіка** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава” прайшоў літаратурны агляд да Дня праваслаўнай кнігі “Жывое слова мудрасці духоўнай”. Чытачы пазнаёміліся з кнігамі, якія вучаць дабру, дапамагаюць знайсці сэнс жыцця і сфарміраваць правільныя каштоўнасці. Даведаліся пра святыя, праваслаўныя храмы Беларусі і гісторыю духоўнай кнігі. Мерапрыемства нагадала: праваслаўная кніга - крыніца святла і дабра.

**14 сакавіка** ў філіяле “Васілішкаўская сельская бібліятэка” хлопцы і дзяўчынкі адправіліся ў экскурс у мінулае “Праз кнігі — да духоўнасці”. Бібліятэкар расказала пра Дзень праваслаўнай кнігі, пра першую кнігу на Беларусі і пра тое, што духоўная літаратура — гэта кнігі, якія вучаць дабру і міласэрнасці. Дзеці пазнаёміліся з працамі Тамары Замаскавец — цудоўнымі вырабамі з пацерак, якія створаны з вялізным цярпеннем і светлымі думкамі.

**8 лютага** ў філіяле “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка” прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання “Наш край” у рамках праекта “Вахта памяці. Жалудок – мястэчка з гісторыяй” пад назвай “Майстэрства продкаў і цяпло драўляных сцен”. Удзельнікі пазнаёміліся з экспанатамі музея ДУА “Жалудоцкая сярэдняя школа імя У. Урублеўскага”.

**6 студзеня** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аг. Дэмбрава” прайшла душэўная фальклорная мазаіка “Надыходзіць чараўніцтва – цудоўнае свята Каляды!”. Усё было па-святочнаму інтэрактыўна і весела! Бібліятэкар расказала дзецям пра гісторыю і самыя добрыя традыцыі гэтага светлага свята. Удзельнікі адказвалі на пытанні зімовай і каляднай віктарыны.

Завяршылася свята падарункамі і агульнай фатаграфіяй у прыгожай ёлкі.

**11 студзеня** ў філіяле “Тур'янская сельская бібліятэка” пажылыя чытачы сабраліся на гадзіну віншаванняў “Зноў на дарозе Стары Новы год” у рамках абласнога праекта “Разам з кнігай дарогаю дабра”. Бібліятэкар расказала пра традыцыі, прыкметы і пачастункі шчодрага вечара. Госці дзяліліся сямейнымі гісторыямі, успаміналі калядныя варожбы, удзельнічалі ў конкурсах і навагодняй віктарыне. Цёплая сустрэча стала душэўным завяршэннем свят і пакінула светлыя ўспаміны да наступнага года.

**13 студзеня** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аг. Дэмбрава” прайшла вечарына народных традыцый “Вадахрышчанскія традыцыі і абрады”. У рамках праекта “Разам з кнігай дарогаю дабра” бібліятэкар расказала пра гісторыю свята, яго абрады і традыцыі. У цёплай атмасферы госці загадалі добрыя жаданні - па народных прыметах, яны абавязкова спраўдзяцца!



**14 студзеня** ў філіяле “Тур'янская сельская бібліятэка” адбылася святочная праграма “Адчыняй вароты, ідзе каляда!” для выхаванцаў дзіцячага сада аграгарадка Тур'я. Дзеці прыбраліся ў яркія касцюмы, весела спявалі калядкі, чыталі вершы, адгадвалі загадкі і ўдзельнічалі ў конкурсах.

**16 лютага** ў філіяле “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання “Працягваем традыцыі нашых продкаў”. Гасцямі

мерапрыемства сталі супрацонікі ДУК “Шчучынскі РЦКіНТ”, якія расказалі пра традыцыйныя рамёствы, такія як вязанне, вышыўка і пляценне.  Для рабят была арганізавана выстава традыцыйных работ рукадзельніц, выкананых па канонах нашых бабуль і дзядуляў. Каб дзеці не сумавалі, для іх былі падрыхтаваны вясёлыя гульні і конкурсы.

**28 лютага** ў філіяле “Навадворская сельская бібліятэка” адбылося мерапрыемства ў фармаце арт-прасторы пад назвай “Дэкаратыўна-прыкладная творчасць роднага краю”. Удзельнікі пазнаёміліся з традыцыйнымі відамі рукадзелля, якімі займаліся жанчыны на тэрыторыі роднага краю ў мінулыя стагоддзі, а таксама даведаліся пра сучасныя накірункі творчасці, папулярныя сёння.

## Міжнародны жаночы дзень

**6 сакавіка** ў філіяле “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” прайшла вечарына-элегія “Пад зоркай Жанчыны!”. Бібліятэкары прысвяцілі падзею Году беларускай жанчыны: прагучалі вершы беларускіх паэтаў, жанчыны спявалі, успаміналі юнацтва і ласкавыя беларускія звароты да мам - у зале ззяла шмат цёплых “зорак”. Вечар завяршыўся цёплымі размовамі аб кнігах, дзецях, унуках.



**7 сакавіка** у філіяле “Інтэграваная бібліятэка аг. Дэмбрава” прайшла святочная праграма ”Царства жанчыны - царства цеплыні і пяшчоты”. Пад музыку і цёплыя

словы бібліятэкар павіншавала прысутных, прачытала лірычныя вершы і цытаты пра жанчыну, вясну і каханне. Для стварэння святочнага настрою правялі вясёлыя конкурсы і гульні, а кніжная выстаўка “Вясновы кніжны букет” пазнаёміла гасцей з тэматычнай літаратурай.

**7 сакавіка** у філіяле “Навадворская сельская бібліятэка” прайшла вечарына-віншаваннеяў “Жанчына. Прыгажосць. Вясна”. Чытачы з задавальненнем удзельнічалі ў вясёлых конкурсах і віктарынах, слухалі любімыя вершы і песні. Азнаёміліся з выставай “Жаночы голас беларускай паэзіі”. Мерапрыемства завяршылася цёплымі пажаданнямі шчасця, здароўя, радасці і кахання ўсім жанчынам.

**7 сакавіка** ў філіяле “Ракавіцкая сельская бібліятэка” прайшла святочная вечарына “Мазаіка вясновых прызнанняў”. Гучалі жарты, песні, вершы і цёплыя віншаванні - у тым ліку ад настаяцеля Ракавіцкага храма іерэя Дзмітрыя Галамбоўскага і ад прадстаўнікоў мужчынскай паловы.

## Міжнародны дзень барацьбы з наркотыкамі

**3 сакавіка** бібліятэкар філіяла “Інтэграваная бібліятэка аг. Дэмбрава” арганізавала дыялогавую пляцоўку “Спакуса вялікая, але жыццё даражэйшае” для старшакласнікаў ДУА “Дэмбраўская сярэдняя школа”. Дзеці прынялі ўдзел у ананімным анкетаванні “Стаўленне падлеткаў да наркаманіі”. Асаблівую цікавасць выклікала відэа-прэзентацыя “Скажам наркотыкам НЕ!” і кніжная выстава “Спыніся і падумай!”.



**4 сакавіка** філіял “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка” запрасіў навучэнцаў на шок-урок “Наркотыкі супраць нас - мы супраць наркотыкаў”. Разам з бібліятэкарамі ўдзельнікі развеялі некаторыя міфы аб наркаманіі і аднагалосна выказаліся на карысць здаровага ладу жыцця.

**6 сакавіка** ў філіяле “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” прайшла дыскусія “Наркотыкі, наркаманы, наркаманія: аргументы “за” і “супраць”. Прайшоў жывы абмен думкамі: удзельнікі выказваліся, жартавалі, часам спрачаліся, але ў цэлым сур'ёзна абмяркоўвалі тэму. У выніку ўсе сышліся на важнай выснове - каб быць здаровым і карысным грамадству, ні ў якім разе не прымаць наркотыкі. Бібліятэкары таксама пазнаёмілі іх з тэматычнай літаратурай і зрабілі агляд выставы “Здароўе на кожнай старонцы”.

## Тыдзень дзіцячай кнігі

**«Тыдзень дзіцячай кнігі»** – гэта свята чытання, радасці і адкрыццяў. Штогод бібліятэкі запрашаюць юных чытачоў у займальны свет кніг, дзе жывуць цуды, прыгоды і добрыя героі. На працягу тыдня дзяцей чакаюць цікавыя мерапрыемствы, гучныя чытанні, віктарыны і сустрэчы з любімымі кніжнымі персанажамі. Галоўная мэта – паказаць, што чытанне можа быць захапляльным і карысным заняткам для кожнага.



**20 сакавіка** філіял “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” арганізаваў свята кнігі “ В кнжном царстве, детском



государстве” для навучэнцаў 3-4 класаў. Адкрыццё Тыдня дзіцячай кнігі перад вясновымі канікуламі - добрая традыцыя. Гэты год для бібліятэкі асаблівы – яна адзначае 75-гадовы юбілей! Дзеці даведаліся, што ўпершыню свята адбылося ў 1943 годзе ў Маскве. Захавальнік кніг распавяла, што кнігі - добрыя сябры і мудрыя настаўнікі. Разам з Мальвінай і Бураціна ўдзельнікі адказвалі на пытанні віктарын, а Кот Базіліо і Ліса Аліса зарадзілі ўсіх вясёлымі танцамі і флэшмобам. Свята прайшло весела і запомніцца як яркая падзея, прысвечаная кнізе і чытанню.

**20 сакавіка** філіял “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка” запрасіў дзяцей на свята кнігі “Імяніны ў кніжнай краіне”. Пачалося мерапрыемства з расповеду бібліятэкара пра гісторыю свята: хлопцы і дзяўчынкі даведаліся, адкуль бярэ пачатак Тыдзень дзіцячай кнігі і хто яе заснавальнік. Юныя чытачы ўзгадалі вядомых дзіцячых пісьменнікаў і любімых герояў, адгадвалі загадкі, гулялі ў літаратурныя гульні і адказвалі на пытанні вясёлай віктарыны. Кожны ўдзельнік назваў свае любімыя кнігі і патлумачыў, чым яны яму дарагія. У завяршэнне лепшыя чытачы атрымалі граматы і салодкія прызы.

**21 сакавіка** ў філіяле “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” адбыўся тэатралізаваны паказ “У Кніжным царстве шмат цудаў”. Гасцей чакалі віктарыны, літаратурныя гульні, загадкі і вясёлыя фізкультхвілінкі - кожны знайшоў занятак па душы! А кульмінацыяй стала самая доўгачаканая падзея: узнагароджанне лепшых чытачоў.

**22 сакавіка** ў філіяле “Бакштаўская сельская бібліятэка” прайшоў літаратурны калейдаскоп “Рознакаляровая карусель”. Дзеці з задавальненнем слухалі бібліятэкара, якая пазнаёміла іх з фондам дзіцячай літаратуры і новымі паступленнямі кніг. Юныя чытачы прынялі ўдзел у конкурсах “Збяры верш” і “Самы ўважлівы”, а таксама малявалі любімых казачных герояў.

**22 сакавіка** ў філіяле “Навадворская сельская бібліятэка” прайшло літаратурнае свята “Цудоўнае падарожжа ў краіну кніг”. Бібліятэкар пазнаёміла хлопчыкаў і дзяўчынак з гісторыяй свята дзіцячай кнігі. Юныя чытачы расказвалі аб любімых творах і літаратурных героях, разгадвалі літаратурныя рэбусы, вызначалі чароўныя прадметы па апісанні і адгадвалі герояў кніг па карцінках-загадках. Напрыканцы госці пазнаёміліся з кніжнай выставай “Кніга і ты – сябры назаўжды”.



**24 сакавіка** ў філіяле “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” прайшло мерапрыемства — вуліца натхнення “Чараўнікі па нарошку”. Удзельнікамі сталі выхаванцы лагера ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Шчучына”. Юныя чытачы з задавальненнем адказвалі на пытанні казачнай віктарыны “Казачны калейдаскоп”, угадвалі герояў казак па карцінках, а ў “Кніжным лесе” шукалі птушак, грыбы і ягады, дружна называючы іх. Дзеці праявілі свае творчыя здольнасці і зрабілі яркія закладкі для кніг.

**24 сакавіка** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аг. Дэмбрава” прайшло свята кнігі “Цуд-кнігі – цуда-

дзецям”. З дапамогай прэзентацыі бібліятэкар расказаў дзецям, калі і дзе нарадзілася гэтае цудоўнае свята — Тыдзень дзіцячай кніжкі. Дзеці з задавальненнем прынялі ўдзел у літаратурнай віктарыне “З якой казкі гэтыя радкі?”, адгадвалі загадкі, успаміналі любімыя казкі і апавяданні, чыталі вершы.

## Літаратурныя юбілеі

**16 студзеня** ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі адбылася сустрэча літаратурнай гасцёўні “Ад усёй душы” на тэму “З кнігай пазначана сустрэча», прысвечаная пісьменнікам-юбілярам 2026 года. На мерапрыемстве адбыўся паэтычны салон, чытанне вершаў Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, В. Віткі, М. Пазнякова. **22 студзеня** бібліятэкары філіяла “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” накіраваліся “У госці да пісьменніка”, прысвечанае 105-годдзю І. П. Шамякіну. Святкаванне прайшло ў Народным музеі А.С. Пашкевіч (Цёткі) у рамках праекта "Урок у музеі". Удзельнікамі сустрэчы сталі навучэнцы 11 класа, добра знаёмыя з творчасцю пісьменніка. У канцы сустрэчы яны азнаёміліся з невялікай выставай кніг пісьменніка.

**31 студзеня** філіял “Бакштаўская сельская бібліятэка” запрасіў чытачоў на літаратурную старонку “Чалавек вялікай душы і таленту”, прысвечаную 105-годдзю з дня нараджэння І. П. Шамякіна, беларускага пісьменніка, сцэнарыста і грамадскага дзеяча. Чытачы даведаліся пра шмат цікавых фактаў з жыцця і творчасці Івана Пятровіча, а таксама ўзгадалі раней прачытаныя творы юбіляра.



**31 студзеня** ў філіяле "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава" прайшоў літаратурны альянс "Творца сапраўднага жыцця", прысвечаны 105-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна. Бібліятэкар з дапамогай электроннай прэзентацыі "Таленавіты сын народа" нагадала дзецям пра ключавыя моманты жыцця Івана Шамякіна. Удзельнікі абмеркавалі яго ўклад у развіццё беларускай літаратуры і культуры, а таксама пазнаёміліся з выставай кніг і матэрыялаў, прысвечаных пісьменніку.

**6 лютага** ў філіяле "Інтэграваная бібліятэка аг. Дэмбрава" прайшло дасье юбіляра "Тонкі знаўца чалавечай душы", прысвечанае 105-годдзю Івана Мележа. Удзельнікі пазнаёміліся з выставай яго твораў, даведаліся цікавыя факты з жыцця знакамітага празаіка і ўзгадалі ключавыя этапы яго творчага шляху.

**6 лютага** ў філіяле "Астрынская гарпасялковая бібліятэка" прайшоў бенефіс пісьменніка І.П. Мележа "Аб нашай радзіме праўдзівае апавяданне", прымеркаванае да 105-годдзя з дня нараджэння аўтара. Для навучэнцаў 5-га класа гэта было новае імя, таму мерапрыемства было падрыхтавана з разлікам аповеду пра пісьменніка, як мага цікавей. Дзеці стварылі яго біяграфію, творчы шлях, узнагароду і месца ў памяці аб ім.

**8 лютага** ў філіяле "Тур'янская сельская бібліятэка" прайшла літаратурная гасцёўня "Два класіка - дзве кнігі - дзве гісторыі пра каханне". Бібліятэкар расказала пра вядомых пісьменнікаў І. Шамякіна і І. Мележа, адзначыўшы іх папулярнасць: абодва нарадзіліся на Палессі, былі франтавікамі, народнымі пісьменнікамі і летапісцамі народнага жыцця. Чытачы з цікавасцю

азнаёміліся з іх творчасцю на кніжнай выставе “Таленты літаратурнага слова”. Таксама былі паказаны відэаролікі аб жыцці і творчасці гэтых беларускіх класікаў.

**20 лютага** ўдзельнікаў літаратурна-музычнай гасцёўні “Ад усёй душы” ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі сабралі два значныя стопяцігадовыя юбілеі ў беларускім літаратурным календары: Іван Пятровіч Шамякін і Іван Паўлавіч Мележ. Была магчымасць даведацца больш пра саміх пісьменнікаў, паслухаць іх вершы, прайсціся іх ваеннымі дарогамі і шляхамі-дарогамі іх герояў. Змаглі пачытаць і дзённікавыя запісы, і разгледзець фатаграфіі, і патрымаць у руках кнігі нашых аўтараў.

**6 сакавіка** філіял “Ракавіцкая сельская бібліятэка” сабраў чытачоў на літаратурную віктарыну “Майстар слова – Кандрат Крапіва”, прысвечаную 130-гадоваму юбілею народнага паэта Беларусі. Бібліятэкар пазнаёміла ўдзельнікаў з біяграфіяй самага вядомага байкапісца Беларусі, яго творчым шляхам і насычаным жыццём, поўным стваральнай энергіі. За плячыма пісьменніка — актыўнае, багатае на падзеі і факты жыццё, якое натхняе дагэтуль. З асаблівым захапленнем удзельнікі адказвалі на пытанні літаратурнай віктарыны і чыталі любімыя байкі Кандрата Крапівы.

## Фарміраванне інфармацыйнай культуры



**22 студзеня** бібліятэкар філіяла “Ракавіцкая сельская бібліятэка” арганізаваў выязны дзень інфармацыі для працоўнага калектыву ААТ



“Орля”. Мерапрыемства прайшло па заяўках работнікаў, якім былі прадстаўлены апошнія перыядычныя выданні і цікавыя кніжныя навінкі. Супрацоўнікі прадпрыемства з задавальненнем абмянялі ўжо прачытаныя кнігі і часопісы на новыя.

**27 студзеня** адбыўся выязны дзень інфармацыі, арганізаваны спецыялістамі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі для супрацоўнікаў мясцовага філіяла ААТ “Малочны мір”. Мерапрыемства дазволіла работнікам прадпрыемства ў зручным фармаце пазнаёміцца з навінкамі перыёдыкі і кніжнымі бэстсэлерамі. Галоўнай падзеяй дня стала акцыя кнігаабмену, дзе кожны ахвочы мог абмяняць ужо прачытаныя кнігі і часопісы на свежыя выданні з бібліятэчнага фонду.

## Павышэнне прафесійнага майстэрства



**30 студзеня** у ДУК “Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі” адбылася вытворчая сустрэча, на якой былі падведзены вынікі працы за 2025 год. Падчас абмеркавання акцэнт быў зроблены на ключавых дасягненнях і выяўленых праблемах. Удзельнікі сустрэчы таксама разгледзелі накірункі дзейнасці на 2026 год.



**11 сакавіка** на базе ДУК "Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі" адбылася інтэрактыўная сесія на тэму "Бібліятэка як брэнд. Стварэнне кантэнту для сацыяльных сетак". У ходзе сесіі былі разгледжаны ключавыя аспекты: што такое брэнд бібліятэкі і з чаго ён складаецца; як здымаць відэа і фота, якія хочацца захаваць; спецыфіка стварэння кантэнту для розных платформаў (Telegram, VK, TikTok). Галоўная каштоўнасць сустрэчы - практычная накіраванасць. Напрыканцы мерапрыемства быў зроблены агляд сацыяльна значных выданняў.



Бібліятэкар аддзела маркетынгу,
сацыякультурнай дзейнасці і
метадычнай работы А.С. Бочка